

Падчас пасяджэння калегіі

# Кадры вырашаюць

## Як выгадаваць дастойных спецыялістаў

**Пасяджэнне калегіі Міністэрства культуры па кадравым забеспячэнні і падрыхтоўцы спецыялістаў адбылося 13 снежня ў спартыўна-культурным цэнтры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.**

Перад сходам увазе членаў калегіі і навучэнцаў адукацыйных устаноў у сферы культуры прадставілі творчы праект "Лінія памяці. Код вайны", рэалізаваны студэнтамі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў і ўдастоены гранта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Спектакль распавядае пра 1941—1945 гады, акупацыю Беларусі і страшныя падзеі, якія перажыў наш народ. У пастаноўцы, прасякнутай гістарычнай памяццю, зліліся танец, музыка, вершы і акцёрскае майстэрства. Сумясціўшы ўсе гэтыя напрамкі ў адзіным праекце, аўтары змаглі перадаць боль і жах узброенай барацьбы. Галоўная задума пастаноўкі — на прыкладзе Вялікай Айчыннай данесці да новых пакаленняў, што вайна недапушчальная. Спектакль зрабіў на прысутных надзвычайнае ўражанне.

Як адзначыў пасля прагляду міністр культуры **Анатолій Маркевіч**, гэты праект павінен быць паказаны ва ўсіх рэгіёнах. Праз харэаграфію маладыя людзі распавялі пра трагедыю, якая напаткала нашу краіну. Беларусы выстаялі і прадэманстравалі ўсяму свету, што зламаць наш дух немагчыма. Вельмі важна: пра гэта ведае моладзь, якая здзейсніла каласальную работу і выклікала непаўторныя эмоцыі. Па словах міністра, мы павінны памятаць і шанаваць тое, што ёсць на нашай зямлі. Мір і спакой — самае каштоўнае, што можа мець любы народ.

— Неабходна выхоўваць патрыётаў. Каб жыць у згодзе, разумець адзін аднаго і будаваць планы, чалавек мусіць любіць Радзіму, ведаць яе гісторыю, — падкрэсліў Анатолій Маркевіч.

### СІСТЭМНАЯ РАБОТА

У прывітальным слове да ўдзельнікаў пасяджэння міністр канстатаваў, што кадравай палітыцы ў сферы культуры заўсёды надавалася самая пільная ўвага: ад узроўню спецыялістаў залежыць, у якой ступені культура будзе ўплываць на беларусаў.

— Сёння наша галіна налічвае больш за 5000 арганізацый і звыш 60 000 штатных адзінак, а забяспечанасць кадрамі складае каля 96 %, — сказаў Анатолій Маркевіч. — Апошнім часам намецілася пазітыўная тэндэнцыя амаладжэння кіраўнікоў: іх сярэдні ўзрост — 46. Штогод больш за 3000 кіраўнікоў сферы адпраўляюць ва ўстановы культуры для павышэння кваліфікацыі. Здавалася б, нядрэнны вынік, але трэба ісці значна далей.

Як лічыць Анатолій Мечыслававіч, мы павінны дакладна бачыць стройную сістэму падрыхтоўкі супрацоўнікаў сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных устаноў, а пачынаць прафарыентацыю належыць са школ. Таксама варта прааналізаваць, як маладых спецыялістаў сустракаюць на месцах работы, якія створаны сацыяльна-бытавыя ўмовы і якія меры стымулявання прымаюцца. На першы погляд гэтыя пытанні ляжаць на паверхні, але на самай справе яны патрабуюць вельмі сур'ёзнай дапрацоўкі.

На думку Анатолія Маркевіча, мэтавая падрыхтоўка спецыялістаў вымагае мадэрнізацыі. Неабходна аб'ектыўна ацаніць сітуацыю і стварыць сістэму, якая дазволіць пакрокава вырашаць праблему кадраў, бо без прафесіяналаў у сферы культуры нічога пазітыўнага не адбудзецца. У галіне мусяць працаваць людзі, якія атрымалі спецыяльную адукацыю, ведаюць асаблівасці работы і бачаць канчатковы вынік. Міністр таксама зазначыў, што гэта дасць магчымасць рыхтаваць адмыслоўцаў, якія на высокім узроўні стануць вырашаць задачы ад Кіраўніка дзяржавы і Урада. Галоўнае, каб у арганізацыях галіны было цікава, гледачы адпачывалі душой, сэрцам і атрымлівалі асалоду ад таго, што прапануюць калектывы.

— Менавіта праз сферу культуры мы можам і павінны даносіць сапраўдныя каштоўнасці, асноўныя для чалавека, — заўважыў Анатолій Маркевіч. — Яшчэ міністр назваў праблемныя аспекты, сярод якіх замацаванне маладых спецыялістаў, заахвочванне творчай моладзі, мэтавая падрыхтоўка, прафарыентацыя і іншыя.

### ДА ЎЗАЕМАДЗЕЯННЯ

Начальнік аддзела кадравай работы і дзяржаўных узнагарод Міністэрства культуры **Вольга Германовіч** выступіла з дакладам аб кадравым забеспячэнні галіны, адзначыўшы пэўныя поспехі ў гэтым напрамку. За апошнія тры гады каля 100 супрацоўнікаў сферы ўшанаваны дзяржаўнымі ўзнагародамі, а сёлета каля 650 заахвочаны ўзнагародамі Міністэрства культуры.

— У Беларусі паслугі насельніцтву ў нашай галіне аказвае 1040 арганізацый з правам юрыдычнай асобы: 40 % — установы адукацыі, 22 % — установы клубнага тыпу, 13 % — бібліятэкі, 14 % — музеі, 5 % — канцэртныя і тэатральна-відовішчныя арганізацыі, — адзначыла Вольга Германовіч. — Агулам у сферы працуе больш за 55 000 чалавек. Дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ажыццяўляюць 372 дзяржслужачыя, сярэдні ўзрост якіх — 42 гады.

Таксама была прааналізавана статыстыка патрэбы ў кадрах па абласцях і раёнах. Установы адукацыі ў сферы культуры штогод выпускаюць каля 1500 спецыялістаў. Для поўнага ўкамплектавання калектываў работнікамі неабходна ўзаемадзеянне арганізацый — заказчыкаў кадраў з установамі адукацыі і кадравая дыягностыка. За апошнія тры гады ў арганізацыі галіны прыбыло больш за 3000 маладых спецыялістаў.

### НАПРАМКІ РАЗВІЦЦЯ

У краіне працуе 415 устаноў адукацыі ў сферы культуры, у якіх навучаецца звыш 126 000 студэнтаў. Штогод больш за 2000 чалавек папаўняе шэрагі першакурснікаў. Начальнік аддзела ўстаноў адукацыі Міністэрства культуры **Марына Юркевіч** распавяла аб выніках аналізу працы па падрыхтоўцы спецыялістаў. Сярод іншага Марына Браніславаўна назвала праблемныя моманты, такія як адток таленавітай моладзі, неабходнасць узмацнення прафарыентацыйнай работы і замацавання спецыялістаў на месцах, а таксама прапанавала шляхі вырашэння гэтых пытанняў.

Міністр культуры ініцыяваў актыўнае абмеркаванне і ўсебаковы разгляд якасці павышэння кваліфікацыі і разнастайнасці культурнай прасторы, а таксама праблем, што датычацца фінансавай часткі, — стымулюючых выплат, тарыфных разрадаў. Анатолій Мечыслававіч арыентаваў прысутных на тое, што неабходна ўдасканаліць шэраг напрамкаў работы галіны. Пасля пасяджэння былі канкрэтызаваны задачы і даручэнні, абазначаны рашэнні калегіі і тэрміны іх выканання.

**Антон РУДАК**

Яшчэ больш фота — у Telegram-канале Міністэрства культуры



Сцэна са спектакля